**А. Я. Паўлава**

# МАТЭРЫЯЛЫ АСАБІСТАГА АРХІЎНАГА ФОНДУ ПІСЬМЕННІКА Р. В. НЯХАЯ ЯК КРЫНІЦА АБ ПАРТЫЗАНСКІМ РУХУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У складзе асабістых архіўных фондаў у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваецца значная колькасць дакументаў і матэрыялаў, якія асвятляюць падзеі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Адным з такіх комплексаў з'яўляецца збор беларускага пісьменніка-франтавіка Рыгора Восіпавіча Няхая, які ў 1942–1943 гг. выконваў у тыле ворагаў заданні Галоўнага разведупраўлення. Пасля заканчэння вайны Р. В. Няхай працаваў рэдактарам аддзела крытыкі і публіцыстыкі газеты "Літаратура і мастацтва" і рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР.

У архіўным фондзе Р. Няхая ўтрымліваецца багаты комплекс матэрыялаў, у якім можна выдзеліць некалькі груп. Важнай крыніцай аб партызанскай барацьбе з'яўляюцца лісты. Сярод матэрыялаў фонду знаходзіцца копія ліста ў ЦК ЛКСМБ ад камандзіраў і байцоў Беларускай камсамольска-маладзёжнай дыверсійнай брыгады асобага прызначэння з просьбай надаць брыгадзе імя У. І. Леніна. Сваю просьбу партызаны падмацавалі справаздачай аб выніках дзейнасці партызанскага фарміравання, да 70 % асабовага складу якога складалі камсамольцы. Таксама прыведзены тэкст Пастановы Бюро ЦК ЛКСМБ ад 12.10.1942 г. са станоўчай рэзалюцыяй за подпісам сакратара М. Зімяніна [5, арк.16–17].

Наступны ліст,“Мая Рыма”, у ЦК ЛКСМБ напісала Вера Маркаўна Кунько. Трое дзяцей Веры Маркаўны з вясны 1942 г. удзельнічалі ў партызанскім руху. Сын Уладзімір і дачка Рыма загінулі. 17-гадовая партызанка асобнага партызанскага атрада імя К. К. Ракасоўскага Магілёўскай вобласці Рыма Кунько з’яўлялася членам дыверсійнай групы, пры ажыццяўленні адной з дыверсій на чыгунцы была паранена. 1 ліпеня 1944 г., калі атрад рухаўся на злучэнне з войскамі РСЧА, партызаны ўступілі ў бой супраць гітлераўцаў, якія вырваліся з Бабруйскага “катла”. Падчас цяжкага бою Рыма загінула [5, арк.1–3].

У зборы знаходзіцца і перапіска дзяўчат-франтавічак воінскай часці 45 991 з партызанкамі 277-га партызанскага палка Клічаўскай ВАГ Магілёўскай вобласці. Ліст франтавічак па стылі нагадвае заклік да сумеснай барацьбы дзеля набліжэння Перамогі. Дзяўчаты адзначылі свой унёсак – 17 аднапалчанак за баявыя подзвігі былі ўдастоены ўрадавых ўзнагарод. У партызанскім палку змагаліся 130 дзяўчат. Надзея Лізун і Марыя Шамаль ваявалі з 1942 г., Шура Кок два гады з’яўлялася разведчыцай, Ніна Семак працавала ў шпіталі. У барацьбе былі і страты: загінулі Кацярына Баравікова і Надзея Сай. Партызанкі падтрымалі заклік франтавічак барацьбой набліжаць разгром ворагаў [5, арк. 4–9].

Наступны блок матэрыялаў – гэта публікацыі ў газетах. Асабісты збор акумулюе матэрыялы адразу некалькіх выданняў па тэмах, якія былі звязаны з рэдактарскай дзейнасцю Р. Няхая ці проста выклікалі цікавасць пісьменніка (нарыс Матукоўскага пра Мінскае падполле “1100 дзён”). Праблемны момант працы з гэтымі артыкуламі – Р. В. Няхай не заўсёды пазначаў даты публікацыі і назвы СМІ. Сярод передрукаваных артыкулаў захаваўся тэкст “Дзявочы фронт” з газеты “Чырвоная Зорка” за 8 сакавіка 1942 г. і пасляваенныя артыкулы іншых выданняў аб баявой і дыверсійнай дзейнасці групы А. Колесавай, якая змагалася супраць акупантаў на тэрыторыі Мінскай вобласці ў 1942 г. [10, Арк.1–8].

Артыкул партызанскага камандзіра В. І. Лівенцава “Подзвіг Косці” распавядае пра 12-гадовага Косцю, родных якога забілі гітлераўцы. У адказ хлопчык вырашыў стаць сапраўдным партызанам. Дарослыя партызаны яго берaглі і не часта бралі на аперацыі, тлумачачы, што ў яго няма неабходнага для партызанскай барацьбы атрыбута – аўтамата. Падчас адной з аперацый юны партызан не толькі падпаліў аэрадром г. Барысава, але і здабыў сабе аўтамат. Разам са зброяй Косця выкраў у нямецкага афіцэра планшэт з некалькімі важнымі для партызан картамі [11, арк. 1]. Алоўкавы аўтограф апаведа “Маленькі партызан” расказвае пра асіповіцкіх партызан брыгады А. С. Шашуры – хлопчыка Уладзіміра і яго маці, разведчыцу брыгады, Любоў Курчанскую [8, арк. 1–10].

Дырэктывы ЦК КП(б)б перыяду лета 1941 г. і загад народнага камісара абароны Саюза ССР № 00189 “Аб задачах партызанскага руху” ад 5 верасня 1942 г. патрабавалі для паспяховай барацьбы наладзіць трывалыя сувязі паміж партызанамі і падпольшчыкамі. Захаваныя ў фондзе рукапісы ўспамі-

наў партызанскіх камандзіраў і газетныя публікацыі сведчаць аб пастаянным узаемадзеянні падпольшчыкаў і партызан. Важным кірункам стала ўзаемадзеянне з мэтай папаўнення атрадаў новымі байцамі. Крыніцай папаўнення станавіліся падпольшчыкі і вайскоўцы-ўцекачы з нямецкага палону, якія сыходзілі ў лясы ад гітлераўскага праследу. Прыгаданая тэма прасочваецца ў артыкуле газеты “Мінская праўда” пра Дзяржынскае падполле [13, арк. 20]. Матэрыял У. Казачонка пад назвай “Пароль – Уладзімір Іванавіч” распавядае аб стварэнні і папаўненні новымі байцамі пры ўдзеле мінскіх падпольшчыкаў 208-га атрада палкоўніка У. І. Нічыпаровіча ў пачатку 1942 г. і аб лячэнні ў г.Мінску доктарам Марыяй Піліпушкай параненага партызана А. Грачова [12, арк. 12].

Сцэнар прыгодніцкай кінастужкі нагадвае артыкул партызанскага кіраўніка І. Ф. Залатара «Аперацыя “Нівеллінгер”», які ў падрабязнасцях распавядае аб падрыхтоўцы і ажыццяўленні партызанамі брыгады “Дзядькі Колі” (П. Лапаціна) сумесна з барысаўскімі падпольшчыкамі аперацыі па захопе і вывазе ў Маскву начальніка 93-й разведвальна-дыверсійнай школы “Сатурн” палкоўніка Нівеллінгера (ва ўспамінах непасрэднага ўдзельніка падзей І. Ф. Залатара). У гэтай смелай аперацыі разам з П. Ф. Парабковічам удзельнічалі Барыс Качан, Мікалай Капшай, Артур Ржэўцкі, Уладзімір Рудак і Нікіфар Аляхновіч, а таксама Люся Чалоўская [13, арк. 28–30]. Пытанне наконт палкоўніка Нівеллінгера і яго прыналежнасці да Барысаўскай абвер-школы, як адзначае С. В. Кулінок, з’яўляецца на цяперашні час спрэчным (у архіўных дакументах і пазнейшых манаграфіях і даследаваннях, сярод выкладчыкаў і кіраўнікоў Барысаўскай абвер-школы прозвішча Нівелінгер не сустракаецца). Верагодна, адбылося выкраданне партызанамі супрацоўніка іншага падраздзялення абвера або іншага сакрэтнага органа, які меў дачыненне да разведвальнай дзейнасці праціўніка.

Матэрыял былога рэдактара газеты “Кліч Радзімы” падпольнага РК кампартыі БССР А.Сакевіча прысвечаны значэнню ў гісторыі партызанскай барацьбы ўрочышча Зыслаў, дзе ў ваенны час знаходзілася база Мінскага падпольнага абкама, кіраўніцтва Любанскіх РК КП(б0 і камсамола, штаб Мінскага партызанскага злучэння і партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі. Менавіта там у 1942 г. быў пабудаваны партызанскі аэрадром і ў прывезенай друкарні з пачатку 1943 г. выдаваліся нумары газет “Звязда” і “Чырвоная змена” [13, арк. 19].

У савецкі перыяд напярэдадні Дня Перамогі ўдзельнікі падпольнай іпартызанскай барацьбы, кіраўнікі і радавыя байцы па традыцыі сустракаліся ў рэдакцыях вядучых газет. Вялікая стэнаграфічная справаздача сустрэчы пад назвай “Партызанскі подзвіг” за 1974 г. (вядучы мерапрыемства – П. К. Панамарэнка) заслугоўвае вывучэння маладымі даследчыкамі: у дакуменце прадстаўлены шырокі спектр інфармацыі пра розныя аспекты партызанскай барацьбы. Нарыс пацвярджае тэзіс аб удзеле ў партызанскай барацьбе людзей розных узростаў і прафесій [ 13, арк. 25–26].

Гаворачы аб пачатку партызанскай барацьбы, Э. Б. Нордман, які ваяваў у атрадзе У. З. Каржа, адзначаў: "Сыходзілі ў лес невялікім атрадам – 50 чалавек. Мне дасталася вінтоўка ўзору 1891. Нават цёплых рэчаў не назапасілі. Здавалася – вайна справа не доўгая. Ніхто не меркаваў, што давядзецца пражыць у лесе 3 гады". Камандзір дыверсійнай групы 125-й Капаткевіцкай брыгады Палескай вобласці Р. А. Такуеў у складзе групы з 12 чалавек збег з эшалона, які перавозіў ваеннапалонных. Да партызанскага атрада 20 мая 1942 года змаглі дабрацца толькі 3. Камандзір падрыўнікоў Ф. А. Бачыла прыгадаў, што для здзяйснення дыверсій на чыгунцы даводзілася праходзіць з грузам у некалькі дзясяткаў кілаграм да 40 км за ноч. Камандзір брыгады "Няўлоўныя" М. С. Пруднікаў захаваў дзённік брыгады, якая правяла 511 аперацый, і успомніў буйную аперацыю па падрыве нафтабазы ў г. Полацку. Вопыт стварэння ва ўмовах недахопу зброі партызанскіх гранат асаблівай канструкцыі паўплываў на будучую прафесійную дзейнасць Т. Е. Шаўгулідзэ пасля вайны. М. М. Сіманаў сведчыў, што веданне нямецкай мовы шмат разоў дапамагала партызанам. Так, Э. Б. Нордман у складаны перыяд дзейнасці атрада В. З. Каржа добра выканаў ролю "каменданта Шульца" восенню 1941 г.: партызаны змаглі знішчыць паліцэйскіх у сяле Чырвонае Возера і завалодаць патрэбнымі для атрада вінтоўкамі. Камандзіры разумелі неабходнасць рознымі спосабамі захаваць памяць аб баявых подзвігах партызан і выкарыстоўвалі мастацкія таленты байцоў. М. І. Абрыньба атрымаў ад камандавання атрада заданне маляваць партрэты партызан, якія вызначыліся ў баі, а крыху пазней – зрабіць замалёўкі на месцы буйнога бою каля вёскі Пышна, дзе, прыкрываючы адыход таварышаў, загінула маладая пара партызан С. Клопаў і Н. Касцючэнка. У партызанскай брыгадзе Дубава ў зямлянцы стварылі галерэю работ мастака М. Т. Гуціева. У цяжкіх ваенных умовах людзі знаходзілі магчымасці ратаваць хворых або параненых баявых таварышаў. У. А. Парахневіч двое сутак міма гітлераўскіх кардонаў вёз на падводзе параненых у баі і захварэўшых пасля пераправы праз халодную раку таварышаў. Сябра Р.А.Такуева Яўген Каноплін прайшоў 80 км, каб даведацца пра стан таварыша і дапамагчы арганізаваць яго адпраўку на Вялікую зямлю. Былыя партызаны падзяліліся ўспамінамі аб песенных хвілінах адпачынку паміж аперацыямі, лясных школах для дзяцей, неабходнасці ратавацца ў балотах ва ўмовах гітлераўскіх аперацый супраць партызан, аб Ушацкім прарыве і партызанскім парадзе ў Мінску ў ліпені 1944 г. Былыя партызаны з удзячнасцю ўспаміналі ўрачоў і мясцовых сялян, якія дапамагалі лячыцца, набірацца сіл параненым і хворым байцам [13, арк. 25–26].

У фондзе Р. В. Няхая ўтрымліваюцца матэрыялы рэдагавання і літаратурнай апрацоўкі мемуараў аб падпольнай і партызанскай барацьбе камандзіра 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады В. І. Ліванцава "Партызанскі край" (за 1956 г), камандзіра Пінскай партызанскай брыгады І. Шубітыдзэ "Палескія былі" (за 1969 г.) і кіраўніка Палескага партызанскага злучэння І. Д. Ветрава "Дружба, загартаваная ў агні барацьбы" і "Браты па зброі" (за

1962 г.). Гэтыя матэрыялы дазваляюць даведацца пра асаблівасці арганізацыі і развіцця партызанскай барацьбы на тэрыторыі Гомельскай, Магілёўскай абласцей і ўсходняй часткі сучаснай Брэсцкай. Названыя рукапісы ўяўляюць цікавасць для даследчыкаў у сувязі з тым, што ўтрымліваюць значна больш дэталёвы факталагічны матэрыял у параўнанні з выніковым выдадзеным варыянтам.

Рукапіс, які змяшчае інфармацыю аб пачатку падпольнай дзейнасці ў Бабруйску і партызанскай барацьбе В. І. Лівенцава, адносіцца да 1950-х гадоў. Не здолеўшы прабіцца да войскаў РСЧА, у канцы ліпеня 1941 года В. Лівенцаў апынуўся ў акупаваным Бабруйску. Ён звязаўся з мясцовымі патрыётамі і іншымі акружэнцамі, стаў кіраўніком падпольнай групы і адным з каардынатараў падпольнай барацьбы ў Бабруйску [2, арк. 1–27]. Пасля 5 месяцаў напружанай барацьбы ў канцы 1941 года арганізацыямі В. Лівенцава і І.Хімічава былі выведзеныя ў партызанскія атрады каля 400 чалавек. Гэта быў адзіны выпадак вываду такой буйной падпольнай групы ў лес без правалу. У рукапісе В. І. Лівенцава падрабязна распавядаецца аб дэбатах з Бабруйскім камітэтам партызанскага руху наконт магчымасцяў і перспектыў партызанскай барацьбы ва ўмовах горада, аб падрыхтоўцы падпольшчыкамі выхаду з Бабруйска, адпраўцы разведчыкаў-сувязных (П. Маслёнак, І. Хімічаў, В. Чубін) у партызанскія атрады Жлобінскага, Кіраўскага і Кастрычніцкага раёнаў. З тэксту становіцца зразумелым, што не ўсе разведвыхады прайшлі згодна з планам, гітлераўцы падрыхтавалі сур’ёзную правакацыю супраць падпольшчыкаў, якія выходзілі да партызан. У выніку пасля ўсталявання сувязі з атрадам І. Губіна было прынята рашэнне сыходзіць з Бабруйска ў бок Рудабелкі [1, арк. 75–103].

Аўтограф мемуараў Лівенцава распавядае пра баявое хрышчэнне атрада – Цяцерынскі бой, якім кіраваў Д. Ляпёшкін. Партызанскі камбрыг адзначыў аперацыю па знішчэнні паліцэйскіх у Азарычах і Аземлянскі бой. У выніку гэтай аперацыі ў Азарычах байцы Лівенцава забралі дзесяць скрынь з патронамі і анодныя батарэі для радыё, таксама адчынілі тры хлебныя склады і раздалі хлеб мясцовым жыхарам [7, арк. 62–68].

Старонкі рукапісу ўтрымліваюць нататкі В. Лівенцава пра тое, як падбіралі камандзіраў атрадаў у брыгадзе, як арганізоўвалі адпачынак. Тут жа можна прачытаць важныя заўвагі аб культуры цвярозасці і супрацьдзеянні лаянцы сярод байцоў атрада. Лівенцаў адзначаў, што пры арганізацыі атрадаў брыгады стараліся прызначаць камандзірамі не схільных да выпіўкі людзей, напамінаючы: “замест таго, каб аддаць жыццё ў баі, ты можаш аддаць яе па п’янай цісканіне”. Са слоў партызанскага камандзіра, матам амаль ніхто не лаяўся. Лаянку прыпынялі, але без спагнанняў. З тэксту вынікае, што ў пачатку 1942 г. сярод шэрагу камандзіраў атрадаў усё яшчэ былі папулярнымі ідэі прарывацца за лінію фронту, таму партызаны В. Лівенцава пачалі рух у паўночна-ўсходнім кірунку на Вялікія Лукі–Невель [7, арк. 64–68]. Матэрыялы аб партызанскай дзейнасці В. І. Лівенцава і 1-й Бабруйскай брыгады ўдала дапаўняюць фатаграфіі і малюнкі мастака Л. Бойка аб дзейнасці партызан і штодзённым жыцці [14].

Камандзір Палескага партызанскага злучэння І. Д. Ветраў разам з успамінамі непасрэдна пра партызанскую дзейнасць падрыхтаваў для Р. В. Няхая спіс 75 камандзіраў палескіх партызан і найбольш актыўных радавых байцоў, якіх варта было паказаць у кнізе [3, арк 1–60; 9, арк. 45–47]. На тэрыторыі БССР супраць гітлераўцаў пасля праведзенай савецкімі патрыётамі работы рады партызан папоўнілі 1 тысяча чэхаў і славакаў і больш за 100 венграў. Сярод дакументаў, што прыкладзены да рукапісу ўспамінаў І. Д. Ветрава, знаходзяцца спіс складу славакаў у Палескім злучэнні (у спісе пазначаны шмат славакаў, якіх не прыгадвала ў сваіх артыкулах гісторык Э. Ф. Языковіч; з указаных 41 партызана-славака загінулі 17) і спіс 20 найважнейшых аперацый партызан з удзелам славакаў у другой палове 1942–1943 г. [9, арк. 48, 52]. Значны блок матэрыялаў у рукапісе І. Д. Ветрава прысвечаны аповеду пра падрыхтоўку, арганізацыю і непасрэдна пераход славацкіх вайскоўцаў на бок савецкіх партызан [9, арк. 9–28].

У пасляваенным нарысе-лісце да І. Ветрава былы партызан 125-й брыгады Андрэй Аравец даволі падрабязна распавядаў, як славакі далучыліся да барацьбы беларускіх партызан, а таксама пра баявыя аперацыі: бой за вёску Залессе, дыверсіі на чыгунцы, бой за станцыю Муляроўка. Андрэй прыгадвае, наколькі важнай для партызан была соль. Партызаны забіралі соль з узарваных нямецкіх эшалонаў або выкарыстоўвалі замест солі хімічныя рэчывы. Былы славацкі партызан распавядаў і пра карную аперацыю гітлераўцаў супраць партызан у раёне ўрочышча Зыслаў [9, арк. 1–8].

Як сцвярджае І. Д. Ветраў, партызаны і падпольшчыкі 17 раёнаў праводзілі дзейнасць па распрапагандаванні салдат гарнізонаў праціўніка. Партызанскія разведчыкі і сувязныя распаўсюджвалі па варожых гарнізонах рэгіёна партызанскія газеты, улёткі, звароты да нямецкіх і венгерскіх салдат. Складанасць такой працы заўсёды была ў адсутнасці поўнай упэўненасці ў намерах замежных салдат перайсці на бок партызан. У рукапісе ўтрымліваецца інфармацыя аб пераходзе венгерскіх салдат (і інфармацыя пра кожнага з гэтых 39 салдат) у 125-ю Капаткевіцкую брыгаду, 99-ю брыгаду, дыверсійны атрад Такуева Р. А. [9, арк. 13–28]. Самым масавым быў пераход мад’ярскіх салдат у Хойніцкім раёне. Там працу па далучэнні венгерскіх салдат гарнізона Хойнікі і станцыі Аўрамаўская да савецкіх партызан паспяхова правялі настаўнікі школы вёскі Хвойная – сувязная атрада імя Суворава (камандзір К. Т. Сацура) Тамара Шапавалава і яе муж С. В. Ракіта з дапамогай славака М. Шухая [ 9, арк. 34–44]. Цікава, што ў спісах венгерскім партызанам імёны і імёны па бацьку перапісвалі на славянскі манер. Факты пераходу венграў да партызан былі зафіксаваны і ў іншых раёнах Палескай вобласці. Амаль усе венгры, якія далучыліся да палескіх партызан, прытрымліваліся партызанскй прысягі, удзельнічалі ў аперацыях, выданні партызанскіх газет і напісанні лістоў беларускіх партызан “людажору Гітлеру”. Тэкст аднаго з такіх вершаваных лістоў прыведзены ў рукапісе [9, арк. 25–27].

Рыгор Восіпавіч Няхай выступіў літаратурным рэдактарам кнігі камандзіра Пінскай партызанскай брыгады І. Шубітыдзэ “Палескія былі”. Некалькі варыянтаў гэтых мемуараў таксама знаходзяцца ў фондзе пісьменніка. На старонках рукапісу можна прачытаць, як у лютым 1943 г. партызаны

і падпольшчыкі сарвалі масавы ўгон пінчан і жыхароў раёна ў Германію. Важнай акалічнасцю аперацыі было не дапусціць менавіта самой адпраўкі эшалона, таму што цягнік маглі падарваць партызанскія группы, якія не ведалі пра людзей [6, арк. 72–81]. Гэты аспект тым больш важны ў кантэксце пачуццяў партызан у дачыненні да дыверсій на чыгунцы: “прапусціў цягнікі [у бок фронту] – значыць яны на тваім сумленні”. Пра гэта згадваў камандзір дыверсійнай групы 9-й партызанскай брыгады імя С. М. Кірава Магілёўскай вобласці, У. А. Парахневіч падчас традыцыйнай сустрэчы былых партызан у рэдакцыі газеты “Комсомольская правда” ў 1974 г. [13, арк. 25]. Важнай аперацыяй стаў і разгром паліцэйскага гарнізона ў Парэччы. Пасля ліквідацыі гэтай перашкоды партызаны маглі планаваць аперацыю супраць гарнізона ў Лагішыне, больш спакойна ажыццяўляць рух атрадаў у Целяханскія лясы [6, арк. 96–99].

Для аўтараў і рэдактараў важнай часткай працы над кожнымі мемуарамі асабліва карыснымі з’яўляюцца водгукі чытачоў, непасрэдных удзельнікаў падзей, аб змесце кнігі. Яны дапамагаюць выправіць памылкі, дапушчаныя ў тэксце. У фондзе захаваўся ліст Р. В. Няхаю ад С. А. Хмялеўскай, якая была сакратаром адной з падпольных камсамольскіх арганізацый Іванаўскага раёна, а пазней разведчыцай атрада В. Цвяткова. Аўтарка ліста адзначыла, што ў кнізе “Палескія былі” замест Серафімы Аляксандраўны пад яе прозвішчам згадалі Серафіма Аляксандравіча. С.Хмялеўская ўдакладніла звесткі пра выканаўцаў шэрагу дыверсій (што ўяўляецца важным, так як кніга “Палескія былі” не перавыдавалася): Іванаўскую электрастанцыю падарваў Васіль Пятроўскі, вузкакалеечнае дэпо – Васіль Мікітчук, нямецкую казарму – Клім Снітавец, жандармерыю ў Пінску – Сцяпан Балюк, дыверсію на чыгунцы здзейсніў Рыгор Сіткавец. Усіх гэтых падпольшчыкаў і іх сем'і пасля дыверсій Серафіма Хмялеўская пераправіла ў партызанскі атрад Цвяткова [4, арк. 2–3].

Падводзячы вынік, можна сцвярджаць, што матэрыялы, якія адклаліся ў асабістым фондзе Р. В. Няхая, могуць быць выкарыстаны ў даследаванні гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі БССР і стаць крыніцай новых факталагічных звестак.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 88. Рыгор Восіпавіч Няхай. Воп. 1. Спр. 17.
2. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 18.
3. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 25.
4. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 344.
5. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 431.
6. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 437.
7. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 444.
8. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 448.

9. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 450.
10. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 453.
11. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 473.
12. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 484.
13. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 485.
14. БДМЛМ. – Ф. 88. Воп. 1. Спр. 512–514, 520–522.